***М. П. Саўкова***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

# ФЛАРАЛЬНЫЯ ВОБРАЗЫ-СІМВАЛЫ Ў ІНТЫМНАЙ ЛІРЫЦЫ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

У інтымнай лірыцы Я. Янішчыц адметная роля належыць фларальным вобразам-сімвалам. Паэтка звяртаецца да шматлікіх вобразаў дрэў і кветак: каліны, бярозы, вішні, яблыні, ружы, шыпшыны, палына, чартапалоха і інш. Расліны, на яе думку, жывыя, і таму ўсе яны ўвасабляюць розныя эмоцыі і пачуцці.

Вобраз каліны мае ў Я. Янішчыц традыцыйнае вуснапаэтычнае сэнсавае напаўненне, звязанае з настроямі роспачы, болю, горычы і тугі. Перажыўшы балючае каханне, душа лірычнай гераіні ўвасабляецца ў каліне: «Я так цябе чакала, што ў каліне // Адбілася ўся мая душа!» [1, с. 75]. У беларускім фальклоры каліна абазначае няшчасную жанчыну. Я. Янішчыц выкарыстоўвае сімвал у вершы «Яшчэ не збыты ўспамін…». У вобразе каліны выяўляецца найглыбейшы трагізм, што спараджае пачуццё глыбокай адзіноты лірычнай гераіні. Вобраз шыпшыны ў некаторых вершах Я. Янішчыц набывае філасофскі сэнс, становіцца мастацкім аналагам складаных стасункаў асабістага жыцця або кахання лірычнай гераіні, з’яўляецца сімвалам жаночай долі: «Жыццё маё, як дзікая шыпшына, // Хоць колецца, а ўсё-такі – цвіце» [2, с. 28]. Сімвал палыну мае шырокую семантыку ў вершах Яўгеніі Янішчыц. Адно з галоўных значэнняў сімвала – жыццёвыя пакуты гераіні. Праз вобраз палыну пісьменніца паказвае ўзаемадачыненні як у каханні, так і жыцці ўвогуле: «У схілым шэпце палыноў – // Вясны маёй дыханне, // Але ні рук няма, ні слоў, // Ні слёз на развітанне» [3, с. 169]. Сімвалічнае значэнне набывае ў вершы «Мой горкі прыпамін» бяроза, якая адмысловым чынам спалучаецца з вобразам палыну. У фальклоры бяроза заўсёды лічылася «жаночым» дрэвам. Няма нічога дзіўнага ва ўжыванні гэтых фларальных вобразаў разам, бо калі палын заўсёды асацыяваўся з горам і пакутамі, то бяроза – сімвал радасці, гармоніі, суцяшэння і вытрыманасці.

Асаблівай увагі заслугоўвае вобраз ружы. У вершы «Кантрасты» аўтарка сапраўды таленавіта ўвасобіла супрацьпастауленне колераў, якія, у сваю чаргу, нясуць вялікую сэнсавую нагрузку: «Захінуся шалёнаю сцюжай, // Завяжу вузялочкам кутас. // Чорны воран над белаю ружай: // О, які фантастычны кантраст!» [1, с. 118]. Чорны воран у вершы сімвалізуе сляпую закаханасць юнай дзяўчыны і наступнае яе расчараванне. Пісьменніца нездарма стварае такі кантраст і ўдакладняе колер кветкі – белы. Менавіта ён дазваляе зрабіць выснову, што ружа ў мастацкім свеце лірычнай гераіні – кветка, якая традыцыйна сімвалізуе каханне, а белы колер – свайго роду надзея, рыска ў карціне светлага і шчаслівага жыцця лірычнай гераіні.

Такім чынам, у інтымнай лірыцы Я. Янішчыц фларальныя вобразы – спосаб выражэння думак і пачуццяў пры дапамозе раслін і іх спалучэнняў. Паэтка, у цэлым прытрымліваючыся традыцыйных вуснапаэтычных значэнняў раслінных сімвалаў, узбагачае іх сваімі, арыгінальна-аўтарскімі асацыяцыямі.

## Літаратура

1 Янішчыц, Я. Каліна зімы : кніга лірыкі / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 205 с.
2 Янішчыц, Я. Ясельда: лірыка / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1978. – 122 с.
3 Янішчыц, Я. Пара любові і жалю: кніга лірыкі / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 218 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ